*Работнікі навукі і навучальных вышэйшых устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Умацоўвайце сувязі навукі з вытворчасцю! Рыхтуйце спецыялістаў, дастойных эпохі камунізма!*

(З заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1967 года).


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (668). ПЯТНІЦА, 28 КРАСАВІКА 1967 г. Цана 2 кап. Год выдання XX







## СВЯТА ШЧАСЦЯ І РАДАСЦІ

І. А. КАЖАНКОЎ,
член КПСС з 1917 года.

**Н**АСТУПАЕ ПЕРШАМАЙ. Першамай 1967 года. Першамай юбілейнага года Савецкай улады. Вясна.

Першамай — сімвалічная падзея для ўсіх народаў свету, як дзень барацьбы за свабоду, брацтва ўсіх працоўных, раўнапраўе народаў на зямлі, як дзень вясны. Для нас, савецкіх людзей, Першамай — двайная радасць, бо напярэдадні яго нарадзіўся самы дарагі для працоўных свету чалавек — Уладзімір Ільіч Ленін — заснавальнік бальшавіцкай партыі і Савецкай дзяржавы. Яго нараджэнне было пачаткам нараджэння сапраўднай вясны чалавецтва. Куды ні кінеш погляд — усюды бачны ленінскія ўсходы, урачыстасць і пераможнасць яго ідэй. Вясёлая моладзь штодзённа крочыць побач са мной ва універсітэт на заняткі. Як гэта цудоўна! Якое шчасце ў такім узросце вучыцца ў такой буйнай установе, атрымліваць адукацыю і пасля ехаць на працу. Ідучы, кіну іншы раз погляд на прахадзячага студэнта ў корпусе і думаю: шчаслівая моладзь. І непрыкметна пасля пачынае красціся ў сэрца нейкая зайздрасць да іх лёсу, пачынаюць віцца ў галаве ўспаміны далёкіх часоў майго дзяцінства, юнацкія гады...

ПЕРШАМАЙ 1913 ГОДА. Вясна, але вясна не такая, як цяпер, вясна голаду і цяжкай часіны ў гаспадарцы. Няма ні крошкі хлеба на стале, у свірне сабраны апошнія зярняткі жыта і бульбы, каб як-небудзь пасеяць. На полі неяк ціха і млосна. Худыя кастлявыя коні ледзь-ледзь цягнуць драўляную саху, ледзь-ледзь цягнецца за ёю забіты горам і нястачай, апрануты ў палатняныя лахманы селянін. Зямлі такая вузенькая палоска, ляжаш — ногі дакранаюцца да «надзела» суседа. Галодныя дзеці просяць есці, хлеба. Але дзе ты яго возьмеш. Амаль на кожным кроку — жабракі, адуваваны чалавек у сяле — цуда. Зранку па вёсцы і горадзе шныраюць, бы сабакі, жандармы. Ведаюць: на Першамай людзі выйдуць на дэманстрацыю. Стараюцца схапіць яе арганізатара. Але рабочыя хітрэй за паліцаяў, збіраюцца далёка ў лесе на маёўку. Тут заўжды можна было выказаць адзін аднаму пра сваё гора, нядолю, памеркаваць, што рабіць далей, як пазбавіцца ад невыноснага жыцця. Няўмольна свісталі плёткі жандармаў і казакаў, грымелі стрэлы, якія губілі дзесяткі, сотні жыццяў рабочых. На Першамайскія кветкі падалі гарачыя кроплі рабочай крыві. Але рэвалюцыйнага парыву не маглі утрымаць плёткі і смерць.

Першамай 1913 года мы, сяляне вёскі Забор'е Смаленскай губерні, сустрэлі ў лесе, дзе арганізазалі маёўку. Разгарэлася полымя ад раскладзенага намі агню. Яно падымалася ўсё вышэй і вышэй. І мы гучна, на ўвесь голас, пачалі пець рэвалюцыйныя песні, словы іх клікалі на барацьбу... Толькі позна вечарам мы вярнуліся ў вёску, стомленыя, але натхнёныя і бадзёрыя: мы святкавалі Першамай, мы ў думках заадно з рабочымі...

ПЕРШАМАЙ 1918 ГОДА, горад Парэчча Смаленскай губерні. Бальшавікі, кавалі горада і былыя батракі вёскі адзначаюць свята. Усюды — чырвоныя сцягі. Урачыста і трывожна. Супраць маладой краіны Саветаў апалчылася унутраная і знешняя контррэвалюцыя. На плакатах лозунгі: «Абаронім заваёвы Кастрычніка», «Няхай жывуць Саветы!», «Слава Вялікаму Леніну і яго партыі».

Выступаюць Мясаедаў, Сямёнаў, Казлоў і іншыя таварышы — бальшавікі. Яны даюць клятву быць вернымі партыі і Савецкай уладзе да апошняй кроплі крыві. Наперадзе была барацьба, цяжкая і ўпартая...

МАЙ 1967 ГОДА. Як хутка праляцеў час. Велічнай стала наша краіна. Новыя гарады і сёлы. Новыя заводы і фабрыкі. Шырокія палі і лугі. Школы, інстытуты, акадэміі навук. Непераможныя ўзброеныя сілы. Усё гэта наша, роднае, савецкае.

З адсталай, цёмнай і лапцюжнай Расіі савецкім народам пад кіраўніцтвам ленінскай партыі пабудавана магутная індустрыяльна-калгасная дзяржава з перадавой эканомікай, навукай, тэхнікай.

І няма цяпер на свеце такой сілы, якая б змагла пахіснуць неўміручасць і развіццё ленінскіх ідэй.

## ЗА МІР

*24 красавіка ў палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната адбыўся вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі. У вечары прынялі актыўны ўдзел замежныя і савецкія студэнты нашага універсітэта. Юнакі і дзяўчаты розных краін, розных кантынентаў абмяняліся думкамі па актуальных праблемах міжнароднага маладзёжнага руху—барацьбы за мір, за сацыяльны прагрэс.*

## І ДРУЖБУ

*Хвілінай маўчання яны ўшанавалі памяць лётчыка-касманаўта Савецкага Саюза Ул. М. Камарова. Пасля вечара юнакі і дзяўчаты з В'етнама, Кубы, МНР, Венгрыі, Польшчы, афрыканскіх краін, што навучаюцца ў розных вышэйшых і тэхнічных навучальных установах нашай краіны, прынялі ўдзел у факельным шэсці ў Лошыцу, да помніка палёгшым воінам і партызанам у барацьбе з фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яны пакляліся ў салідарнасці, заўсёды змагацца за шчасце, мір і дружбу ўсіх народаў на зямлі.*

*У. ГАЛАЙША.*

## ЛЕНІНСКАЯ ЭСТАФЕТА

**Стартавала эстафета лёгкаатлетаў, прысвечаная нараджэнню Уладзіміра Ільіча Леніна. Характэрна, што яе ініцыятарам быў наш універсітэт. На працягу васьмі год спартсмены БДУ выйгрывалі ў гэтых цікавых спаборніцтвах. І вось 22 красавіка мацнейшыя бегуны горада выйшлі на старт. Барацьба была напружаная, з пераменным поспехам той ці іншай каманды. Першае месца заваявалі спартсмены ІФК, на другім аказаліся юнакі нашага універсітэта, на трэцім — інстытут замежных моў.**

**Г. МАЛОЧКА,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**



## ВЯСНОВЫ ТРАДЫЦЫЙНЫ

**Па даўняй традыцыі ў канцы красавіка быў праведзены агульнауніверсітэцкі крос. Праграмай было прадугледжана правесці яго ў два этапы. У першым удзельнічала 30 працэнтаў студэнтаў ад кожнага факультэта. У другім — 10 лепшых бегуноў ад факультэта. У двух этапах кроса прыняло ўдзел 1.650 студэнтаў, з іх выканалі II разрад 30 і III — 150.**

**Месцы сярод фізкультурнікаў размеркаваліся наступным чынам: гістарычны, матэматычны, філалагічны, хімічны, геолага-геаграфічны, фізічны, юрыдычны.**

**З пераможцаў неабходна адзначыць добрыя вынікі студэнта III курса гістарычнага факультэта Ф. Леоненкі, які прабег дыстанцыю ў 3.000 метраў за 8,27 мінуты. Недаравальна, што юрыдычны факультэт наогул не прадставіў сваіх удзельнікаў у фінальным кросе.**

## СУСТРЭЛАСЯ ЮНАЦТВА

Партыйныя бюро і камітэты камсамола фізічнага і геолага—геаграфічнага факультэтаў нашага універсітэта вырашылі правесці сумесны вечар, прысвечаны святкаванню 1 Мая.

26 красавіка фізікі, геолагі, географы ва ўрачыстых абставінах сумесна пелі песні, кружыліся ў прыгожым віхры танцаў. Студэнты дзяліліся сваімі поспехамі ў вучобе, і галоўнае, многія фізікі з гэтага дня сталі сапраўднымі шчаслівчыкамі, у іх завязалася цеснае сяброўства з прыгожымі дзяўчатамі-географамі.

# СІМПОЗІУМ СЛАВІСТАЎ



*У зале пасяджэнняў.*

**Набліжаецца шосты Міжнародны кангрэс славістаў. Гэта вялікая падзея ў жыцці славянскіх народаў, і да яе паўсюдна ідзе старанная падрыхтоўка. Праходзяць сімпозіумы, спрэчкі, дыскусіі, якія накіраваны на далейшае збліжэнне культур, моў і літаратур братніх народаў. Таму такія мерапрыемствы праходзяць, як правіла, ажыўлена, з вялікім інтарэсам і збіраюць поўную аўдыторыю. Двойчы славісты праводзілі сімпозіумы ў Расійскай Федэрацыі, сем разоў на Украіне. Да нас, на Беларусь, упершыню прыехалі вучоныя, якія ўсё сваё жыццё, талент і натхненне аддаюць праблемам развіцця славянскіх моў. Сваіх пасланцоў прыслалі Масква, Ленінград, Вільнюс, Алма-Ата, Львоў, Самарканд, Варонеж і іншыя гарады.**

**Сімпозіум, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады, адкрывае ўступным словам прарэктар доктар фізіка-матэматычных навук Л. В. Валадзько. З дакладам аб стане і задачах славістыкі ў Беларусі выступіў старшыня Беларускага камітэта славістаў М. Суднік. На лінгвістычнай і літаратурнай секцыях былі заслуханы даклады і паведамленні па праблемах гісторыі і ўзаемасувязях славянскіх моў і літаратур.**

**Удзельнікі сімпозіума з цікавасцю заслухалі даклады «Аб залежнасці стылістыкі славянскіх літаратурных моў ад характару іх «стандартнасці» М. Талстога, «З праблемы беларускай фразеалогіі» Ф. Янкоўскага, «Праблемы ўзаемадзеянняў беларускай мовы з іншымі мовамі» Б. Лапава.**

**Шэраг выступленняў удзельнікаў сімпозіума быў прысвечан матывам беларускага фальклору ў творчасці асобных пісьменнікаў, «кароткай» байцы ў рускай і беларускай літаратурах, значэнню перакладных свецкіх аповесцей XVI—XVIII стагоддзяў у літаратурным яднанні славян і іншым праблемам.**

**Якія ж мэты і задачы сталі перад сімпозіумам! На гэтае пытанне адказаў мне адзін з яго ініцыятараў, загадчык кафедры рускай мовы БДУ, доктар філалагічных навук Міхаіл Гапеевіч Булахаў:**

**— Славістычныя даследаванні вяліся ў БДУ з самага пачатку яго існавання. Але ў 20—40 гг. нашага стагоддзя гэта праца яшчэ не мела дастаткова шырокага размаху. Толькі ў пасляваенныя гады, калі беларуская мова стала франтальна даследавацца ў дыялекталагічных, граматычных і лексікалагічных адносінах, калі вучоныя пераканаліся ў надзвычайнай каштоўнасці фактаў беларускай мовы для славістыкі, пачалася сістэматычная праца па славянскай філалогіі ў Беларускім універсітэце і іншых вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Шырокі ўдзел студэнтаў, выкладчыкаў БДУ ў зборы і апрацоўцы матэрыялаў для «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы», падрыхтоўка дакладаў для міжнародных кангрэсаў славістаў, напісанне манаграфій і падручнікаў па гісторыі беларускай мовы і літаратуры, па сучаснай літаратурнай мове — усё гэта было неабходным этапам на шляху да шырокай славістычнай праблематыкі. Дзякуючы агульным намаганням беларускіх вучоных, у пасляваенныя гады ў Беларусі склалася і паспяхова развіваецца новая навуковая галіна—беларуская славістыка, якая з'яўляецца неад'емнай часткай савецкага славяназнаўства. За гэты час было напісана многа работ па гэтай важнай і складанай навуцы.**

**Чатыры дні працягваліся гарачыя спрэчкі славістаў. За гэты час было праслухана каля 50 дакладаў. У рабоце сімпозіума непасрэдна прымалі ўдзел 60 беларускіх вучоных і 10 вучоных з іншых рэспублік. Чатыры дні работы праляцелі непрыкметна, і вось зноў, як і ў першы дзень, удзельнікі сімпозіума сабраліся на агульнае пасяджэнне секцый літаратуразнаўства і мовазнаўства.**

**— На секцыі літаратуразнаўства было выслухана 11 дакладаў, — пачаў сваю справаздачу прафесар М. Р. Ларчанка, — усе даклады былі дэталёва абмеркаваны. Выказваючы агульную думку ўдзельнікаў секцыі, я хачу сказаць, што ўсе даклады цікавыя і карысныя для беларускага літаратуразнаўства. Канешне, у параўнанні з секцыяй мовазнаўства мы выглядалі беднавата па той прычыне, што многія нашы абласныя педагагічныя інстытуты не прадставілі работ.**

**З дакладам аб рабоце секцыі мовазнаўства выступіў доктар філалагічных навук прафесар М. Г. Булахаў. Ён гаварыў аб тым, што ўсе 39 дакладаў і паведамленняў маюць вялікае значэнне для развіцця беларускага мовазнаўства, усе яны цікавыя і актуальныя.**

**Пасля справаздачных дакладаў кіраўнікоў секцый была прынята рэзалюцыя, у якой намечаны планы беларускіх славістаў на будучае, напрыклад, такія, як правядзенне славістычных сімпозіумаў раз у адзін—два гады; у канцы 1968 года ў гонар свята ўтварэння БССР правесці сімпозіум славістаў на тэму «Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя і беларусазнаўства», а таксама і іншыя мерапрыемствы.**

**З заключным словам выступіў старшыня арганізацыйнага камітэта сімпозіума доктар філалагічных навук А. Я. Супрун:**

**— У нас, у Беларусі, пытанні славістыкі абмяркоўваліся ўпершыню. Вельмі прыемна, што прыехалі госці. Гэта дало магчымасць павысіць узровень навуковых спрэчак. Шчырае вам дзякуй за тое, што вы прынялі ўдзел у нашым першым рэспубліканскім сімпозіуме.**

**Сімпозіум закончыўся, раз'ехаліся яго ўдзельнікі. Цяпер, падводзячы вынікі, можна сказаць, што ў славістычную работу актыўна ўцягваюцца маладыя вучоныя БДУ, Мінскага педінстытута імя Горкага, абласных педінстытутаў, а таксама маладыя вучоныя АН БССР. Тэарэтычны ўзровень даследаванняў па славістыцы з году ў год павышаецца, таму ёсць падставы меркаваць, што беларускія філолагі-славісты парадуюць нас новымі творчымі дасягненнямі і адкрыццямі.**

**В. РЫДКІ,**
**наш кар.**



*НА ЗДЫМКУ: (злева направа) член Савецкага камітэта славістаў, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства АН СССР, кіраўнік комплекснай праблемы лінгвістычнага вывучэння Палесся Мікіта Ільіч Талстой, загадчык кафедры рускай мовы БДУ імя Леніна доктар філалагічных навук Міхаіл Гапеевіч Булахаў, старшыня беларускага камітэта славістаў, дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР Міхаіл Раманавіч Суднік і загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства БДУ доктар філалагічных навук Адам Яўген'евіч Супрун у перапынку дзеляцца ўражаннямі аб рабоце сімпозіума.*

Фота С. Супруна.

# У МІХАЛІНСКАЙ ПУШЧЫ

На сотні кіламетраў раскінуліся Міхалінскія лясы. Вякамі стаіць апеты легендамі і народнымі песнямі бор. Старажылы расказваюць, што ў былыя часы мядзьведзі прыходзілі да пасячнікаў «у госці» пакаштаваць свежага мёду. Дзічына не ўмяшчалася ў гэтых лясах...

У гады Вялікай Айчыннай вайны дзесяткі вялікіх і маленькіх партызанскіх атрадаў прыняла Міхалінская пушча пад сваю ахову. Лес быў свайго роду базай для брэсцкіх, пінскіх і беластоцкіх партызан. Пушча нагадвала вялікі мурашнік. З раніцы да позняга вечара ішла баявая падрыхтоўка: вучыліся стральбе, кіданню гранат, падрыўной справе. Пасля партызанскія атрады ішлі на заданні, на засады і зноў вярталіся на базу. Усіх укрылі Міхалінскія лясы і ўсім знаходзілася там месца.

Першага Мая 1943 года я знаходзіўся ў Міхалінскай пушчы. Напярэдадні свята самалёты з «Вялікай зямлі» прывезлі нам «гасцінцы»: патроны, гранаты і ўзрыўчатку. У падраздзяленнях праводзіліся гутаркі аб Першым Маі, партызаны бралі канкрэтныя абавязацельствы.

А на досвітку пачалося...

На дзесяткі кіламетраў вакол лесу ішлі цяжкія баі з ворагам. Ляцелі пад адхон варожыя эшалоны, знішчаліся фашысцкія гарнізоны, на дарогах падрываліся аўтамашыны. Адным словам, тут, за сотні каламетраў ад лініі фронту, шугала полымя вайны.

Партызанская брыгада імя Чапаева, у якой я служыў, зрабіла засаду на шашы Ружаны-Пружаны. Гітлераўцы ведалі, што недзе ў гэтым раёне знаходзяцца значныя партызанскія сілы, таму пры пераходзе з Ружан у Пружаны яны прынялі неабходныя меры перасцярогі.

У самым пачатку праходзілі паліцэйскія падраздзяленні, а каля васьмі гадзін раніцы лянівым маршам прайшла пяхота. Мы прытаіліся на 100—150 метраў ад дарогі. Пяхоту прапусцілі... Праз хвіліну ў ахутанай пылам дарозе паказаліся машыны. Мінута, другая і... раптоўная траскатня нашых кулямётаў і аўтаматаў змяняецца разрывам гранат і мін. Цёмна-зялёныя мундзіры шукалі ратунку, кідаліся на абочыну дарогі, беглі назад з гэтага нечаканага пекла.

У гэтым баі было забіта 70 гітлераўскіх ваяк і 132 паранена.

Сонца ўжо стаяла ў зеніце, калі партызаны вярнуліся ў свой лагер. А вечарам яны наладзілі першамайскі баль.

**І. ЗАЗЕКА,**
**дацэнт кафедры рускай літаратуры.**

## У АДНЫХ ШАРЭНГАХ

*Старанна рыхтуюцца да Першага Мая замежныя студэнты. Моладзь з В'етнама, Кубы, Венесуэлы, Польшчы, МНР, Балгарыі, афрыканскіх краін пройдзе ў адных шарэнгах на дэманстрацыі з савецкімі студэнтамі. Цяпер яны святочна ўпрыгожваюць сваю калону — ужо гатовы нацыянальныя сцягі, флагі, транспаранты з лозунгамі: «Свабоду ўсёй Афрыцы!», «В'етнамскі народ пераможа амерыканскіх агрэсараў!», «Няхай жыве в'етнама-савецкая дружба!» і іншыя.*

*І. ІВАШКА.*



На першым здымку першакурсніца біялагічнага факультэта Галя Таневіч. Цяперашні ўвесь працоўны час дзяўчына аддае толькі вучобе. Ведае, трэба шмат ведаў, каб паспяхова вытрымаць вясновую сесію і скончыць першы год навучання ва універсітэце.

Другі здымак зроблены у чытальнай зале біблія тэ-

# МІЖРЭСПУБЛІКАНСКАЯ

XXIII з'езд КПСС звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць авалодвання працоўнымі, нашай моладдзю эканамічнай тэорыяй. Заклік партыі адлюстроўвае запатрабаванні жыцця, хутка растучых вытворчых сіл краіны. Ажыццяўленне новай эканамічнай рэформы садзейнічае далейшаму росту цікавасці студэнцкай моладзі да вывучэння палітычнай эканоміі. Гэта прыкметна на семінарах, дыскусіях, вечарах пытанняў і адказаў, расшырэнні сеткі навукова-даследчых гурткоў і інш.

Вялікае значэнне ў гэтым аспекце маюць студэнцкія навуковыя канферэнцыі.

25—26 сакавіка ў Мінску адбылася XIII студэнцкая навукова-тэхнічная канферэнцыя вну Прыбалтыкі, БССР і Калінінградскай вобласці.

На гэтай канферэнцыі было прадстаўлена 29 вну розных профіляў. У рабоце 31 секцыі, створаных на канферэнцыі, прынялі ўдзел сотні студэнтаў. На прайшоўшай СНТК значная цікавасць была праяўлена да праблем палітычнай эканоміі капіталізма і сацыялізма. На падсекцыі палітычнай эканоміі, якая працавала ў дні канферэнцыі, было заслухана і абмеркавана 22 студэнцкіх даклады па розных эканамічных пытаннях. Тэматыка іх была даволі шырокай. Найбольшая колькасць эканамічных дакладаў была прадстаўлена БПІ (14) і БДУ (15).

Цікавымі былі выступленні студэнта БПІ Э. Лабковіча — «Сацыяльна-эканамічныя вынікі аўтаматызацыі», студэнткі Націеўскай з БДУ — «Капіталістычная эксплуатацыя і рабочая моладзь», студэнткі Качура (таксама БДУ) — «Першыя крокі развіцця машынабудавання і металаапрацоўкі ў БССР». Гэтая работа насіла даследчы характар, пабудавана на цікавым матэрыяле. Добрыя ўраджанні пакінулі даклады студэнткі БПІ Віленскай, студэнта БДУ Паўлава і многіх іншых. Усё гэта гаворыць аб сур'ёзных адносінах да падрыхтоўкі канферэнцыі.

Абмеркаванне праслуханых дакладаў праходзіла актыўна, жыва, цікава. У ім прымалі ўдзел не толькі студэнты, але і выкладчыкі. Было выказана некалькі карысных парад, прапаноў, накіраваных на далейшае развіццё навукова-даследчай

# МАЙСКАЯ ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ



кі імя У. І. Леніна. Штодзённа яна запоўнена студэнтамі. Колькі вывадаў, рашэнняў, самых розных адкрыццяў робіцца тут!..

Фота А. Кадзета.

БІЯФАК

## СЕМІНАР ВЫРАШАЕ ПРАБЛЕМЫ

*У гэтыя перадсвяточныя дні на ўсіх факультэтах нашага універсітэта прайшлі семінары па марксісцка-ленінскай філасофіі. На іх было заслухана больш дваццаці цікавых дакладаў аб праблемах і важнасці «навукі навук» у даследаванні і адкрыцці новага. Важна адзначыць, што семінары заўсёды праходзяць на высокім навуковым і арганізацыйным узроўні. Асабліва змястоўна і цікава прайшоў нядаўна семінар прафесарска-выкладчыцкага калектыву біялагічнага факультэта. Даклад А. Т. Пікулёва і В. Б. Сацукевіча «Праблемы рэгуляцыі метабалізма» выклікаў гарачыя спрэчкі і адабрэнні.*

* * *

*25 красавіка ў Інстытуце генетыкі АН БССР адбылося пасяджэнне генетычнага семінара Беларускага таварыства генетыкаў і селекцыянераў, у састаў якога ўвайшло многа прафесараў, выкладчыкаў біялагічнага факультэта.*

ГЕОЛАГА-ГЕАГРАФІЧНЫ

## МЕСЯЧНІК КУЛЬТУРЫ

**Месячнік барацьбы за парадак і чысціню вырашылі правесці дэканат і партбюро геолага-геаграфічнага факультэта. Але мы папярэдзім чытача, што правядзенне гэтага мерапрыемства зусім не азначае, што студэнты-геолагі і географы лічацца бескультурнымі людзьмі. Геолага-геаграфічны факультэт лічыцца адным з самых дысцыплінаваных: у аўдыторыях, вучэбных кабінетах тут заўсёды чысціня. Але, як кажуць, нельга спыняцца на дасягнутым, заўсёды трэба ісці наперад, імкнуцца да лепшага. Студэнт юбілейнага года, факультэт юбілейнага года павінны быць прыкладнымі ва ўсіх адносінах. Так вырашылі дэканат і партбюро, і таму месячнік барацьбы за парадак і чысціню на факультэце з'явіцца яшчэ адным сур'ёзным укладам у зберажэнне дзяржаўнай маёмасці, а таксама павышэння асабістай культуры кожнага студэнта.**

**М. ВАСЮК.**

ГІСТФАК

## ГАРЫЗОНТЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Шмат добрых спраў на ўліку народных кантралёраў-гісторыкаў. Група заўсёды дзейсна і мэтанакіравана дапамагае дэканату, партыйнаму бюро ў наладжванні кантролю за дысцыплінай студэнтаў, іх наведваннем лекцый, вучобай, зберажэннем дзяржаўнай маёмасці. Для кожнага з членаў групы знайшлася справа па душы, таму і выкананне даручэнняў заўсёды добрае. Кантралёры сваімі карыснымі дзеяннямі заслужылі павагу і аўтарытэт, ім даручаюць самыя адказныя ўчасткі работы. 25 красавіка кантралёры гістфака на сваім чарговым пасяджэнні абмяркоўвалі злабадзённую праблему дня: падрыхтоўку студэнтамі курсавых работ на III курсе дзённай і IV курсе вячэрняй формы навучання. На ім былі прыняты слушныя рэкамендацыі, накіраваныя на паляпшэнне падрыхтоўкі студэнтамі гэтай адказнай работы.

**А. ШЭЛЕГ.**

ФІЗІЧНЫ

## КАБ РАБОТА СПОРЫЛАСЯ

Ідэалагічны сектар камітэта камсамола фізічнага факультэта правёў семінар аб стане ідэалагічнай работы на факультэце. На семінары прысутнічалі камсоргі груп, курсаў. Ішла гутарка аб тым, як абстаяць справы на факультэце ў выхаванні і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў юбілейнага года. Адзначалася, што яшчэ не ўсё ладзіцца ў рабоце ідэалагічнага сектара, што некаторыя камсоргі груп, актывісты не выкарыстоўваюць у сваёй рабоце багаты вопыт выхаваўчай работы, які накоплены камітэтам камсамола універсітэта. Побач з гэтым, было адзначана і шмат плённага, мэтанакіраванага ў рабоце камсамольскіх важакоў. На семінары распрацавана шэраг канкрэтных прапаноў, накіраваных на паляпшэнне ідэалагічнай работы сярод студэнтаў.

ПАДРЫХТОЎЧЫ

## У ГАСЦЯХ У ПІСЬМЕННІКАЎ

У памяшканні Дома Саюза пісьменнікаў БССР адбылася сустрэча з паэтамі і празаікамі рэспублікі. На ёй прысутнічала шмат савецкіх і замежных студэнтаў універсітэта.

ФІЛФАК

## РЭЙД УЗЛЁТАЎЦАЎ

Нядаўна маладыя паэты, студэнты трэцяга курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Мар'ян Дукса і Сяргей Законнікаў па запрашэнню РК ЛКСМБ Лагойскага раёна зрабілі паездку ў саўгас «Косінскі». Хлопцы ехалі са сваімі новымі вершамі. І вось на ўрачыстым вечары, прысвечаным 50-годдзю Савецкай улады, калгаснікі горача апладыравалі маладым паэтам. Мар'ян Дукса і Сяргей Законнікаў запрасілі калгасную моладзь паступаць на вучобу ў наш універсітэт...

На развітанне дырэктар саўгаса ад імя прысутных горача падзякаваў гасцям, запрасіў прыязджаць часцей да іх.

**А. РАМАНАЎ.**

ХІМФАК

## ЗАСЛУЖАНАЯ ЭКСКУРСІЯ

Дэканат, партыйнае бюро і камітэт камсамола хімічнага факультэта за выдатныя поспехі ў вучобе, паводзінах і культуры ўзнагародзілі студэнтаў трэцяга курса бясплатнай пуцёўкай ў Рыгу. Нядаўна трэцякурснікі вярнуліся ва універсітэт з гэтага цікавага падарожжа.

**Б. КАЗЛОВІЧ.**

## ТРЭЦЯМУ СЕМЕСТРУ— ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

**Днямі адбыўся адкрыты партыйны сход матэматычнага факультэта, на парадку дня якога стаяла пытанне «Аб падрыхтоўцы да працоўнага семестра і летняга адпачынку студэнтаў».**

**З дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола В. Якаўчэнка. Ён падрабязна расказаў аб рабоце студэнтаў матэматычнага факультэта ў мінулым працоўным семестры. Амаль усе, хто працаваў на будоўлях Беларусі, на цаліне, з гонарам апраўдалі давер'е. Студэнты-матэматыкі могуць не толькі добра вучыцца, але і выдатна працаваць. Нездарма гавораць, каб пазнаць чалавека, трэба з ім пуд солі з'есці. У працы можна пазнаць характар кожнага. І вельмі прыемна адзначыць, што ў матэматыкаў з'яўляецца яшчэ адна дадатная рыса характару — працавітасць. Добрым словам гавораць аб студэнтах, як аб старанных людзях, жыхары беларускіх і казахскіх гарадоў і вёсак.**

**На сходзе шмат увагі было ўдзелена працоўнаму семестру юбілейнага года. Абмяркоўваліся планы будаўніцтва, у якім прымуць удзел матэматыкі.**

**Было выказана шмат карысных парад па арганізацыі і расстаноўцы сіл, каб ужо на месцы сфарміраваныя брыгады, ведаючы свае абавязкі, як мага хутчэй, без лішняй траты часу, прыступілі да працы. Гэта не выпадкова: сёлета працоўны семестр будзе вельмі гарачым.**





**Цікавы вечар адбыўся днямі ў нашым універсітэце. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці ўсе нумары праграмы выконвалі на англійскай, французскай і іспанскай мовах...**

**Фота А. Кадзета.**

## КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ПЕРАКЛАД

Галоўная мэта выкладання замежных моў у нефілалагічных вышэйшых навучальных установах—навучыць будучых спецыялістаў карыстацца літаратурай іншых краін. Пераклад з замежнай мовы на родную—гэта асноўны сродак кантролю разумення чытаемага тэксту. Чым больш літаратуры можа прачытаць спецыяліст з найменшай затратай часу і сіл, тым лепш. Гэта набывае асабліва важнае значэнне ў наш век, век развіцця навукі і тэхнікі, што нараджае ўзрастаючы паток інфармацыі.

11—14 красавіка кафедра англійскай мовы праводзіла конкурс на лепшы пераклад на фізічным, матэматычным і хімічным факультэтах. Па ўмовах конкурсу яго ўдзельнікі павінны былі перакласці са слоўнікам 1.500 знакаў англійскага тэксту па спецыяльнасці за 60 мінут.

Больш сарака студэнтаў другіх-трэціх курсаў прынялі ўдзел у гэтым спаборніцтве. Большасць справілася з задачай, але былі дапушчаны памылкі і недакладнасці ў перакладзе.

Пераможцамі конкурсу сталі: на фізічным факультэце студэнты другога курса Л. Арлоў і В. Белабровік; на матэматычным — студэнты другога курса Н. Анікіна, Р. Прэсман і Н. Сергіевіч; на хімічным — студэнты трэцяга курса В. Сальнікаў, Л. Разумоўская і Т. Вераб'ёва. Яны паказалі выдатныя навыкі перакладу і ўзнагароджаны прызамі.

Добра справіліся з перакладамі і В. Варачаева, Г. Клюмель, С. Вінакураў, І. Феранчук, Е. Ціткоў (фізічны факультэт); Е. Плецюхова, Р. Ленгнер, Л. Кавалеўская (хімічны факультэт).

**Л. ЧЭГОЛІНА,**
**ст. выкладчык кафедры англійскай мовы.**

# НАВУКОВАЯ...

работы сярод студэнтаў, устанаўленне больш цеснага кантакту паміж калектывамі ВНУ.

З 22 абмеркаваных дакладаў на падсекцыі 14 атрымалі адзнаку «выдатна» і былі рэкамендаваны на гарадскі і рэспубліканскі агляд. Сярод іх даклады студэнтаў нашага універсітэта Паўлава, Качура, Віленскай, Віннікава. 6 дакладаў атрымалі адзнаку «добра» і 2—«здавальняюча».

Даследаванні, атрымаўшыя высокія адзнакі, адначасова былі рэкамендаваны для апублікавання ў зборніку навуковых студэнцкіх работ.

Несумнена, прайшоўшая XIII СНТК сыграла дадатную ролю. Яна будзе садзейнічаць далейшаму росту навуковай зацікаўленасці студэнтаў.

Разам з тым, трэба адзначыць, што ў рабоце канферэнцыі, яе секцый і падсекцый былі і сур'ёзныя недахопы. Дрэнна пастаўлена сістэма апавяшчэння. З вялікім спазненнем была падрыхтавана праграма канферэнцыі і іншыя дакументы, тэрмінова не былі апублікаваны тэзісы дакладаў і г. д. Не ўсё зрабілі кафедры палітэканоміі ВНУ—удзельнікі канферэнцыі, на пасяджэннях секцый было мала студэнтаў—членаў навуковых гурткоў, аспірантаў, выкладчыкаў. Відаць, на будучае неабходна ўлічыць гэтыя недахопы і больш арганізавана праводзіць такія адказныя канферэнцыі.

**А. БУРАЎСКІ,**
**кандыдат эканамічных навук.**

# ЗВОНКА ПЛЕШЧУЦЬ ВЯСНОЙ КРЫНІЦЫ



НАРАЧ.
Фотаэцюд.

*Іван СТАНКЕВІЧ*

## ПРЫХОДЗЯЦЬ СНЫ

Да людзей ноччу прыходзяць сны,
Рознакалёрныя і рознамаштабныя:
Маці прысняцца яе сыны,
Дужыя і прывабныя,
Закаханым—спатканні,
Падарожніку—стужкі дарог;
Касманаўту—бязважкасці ваганні;
Калгасніку—мяккі мурог.
А я сасню шар зямны,
Над ім бэзу галінку духмяную,
Зялёную свежасць калін,
Іх крокі ў май нячутныя.

*Уладзімір ДЗЮБА*

## НА ПРЫПЯЦІ

*На Прыпяці*
*пагойдваюцца лодкі,*
*а ў лодках —*
*землякі-палешукі*
*з узнёслай думкай*
*і спрадвечнай:*
*толькі б*
*быць побач каля*
*удумлівай ракі.*
*А з вышыні арлінага*
*палёту*
*галінкаю здаецца*
*Прыпяць мне*
*Здаецца мне:*
*на Прыпяці не лодкі—*
*пупышкі,*
*што набухлі па вясне.*
*Яшчэ імгненне —*
*і пупышкі лопнуць,*
*кастрамі ўспыхне роўны*
*глянец ракі.*
*І будзе юшка выкіпаць*
*на лотаць,*
*і песню завядуць*
*палешукі.*

*Сяргей ЗАКОННІКАЎ*

## ЛЯ КУЗНІ

Як злодзея, пяньковым
путам вяжуць
Шалёнага, крутога
жарабка
Ля кузні чорнай ад дымоў
і сажы,
Аж звоняць цуглі
ў жылістых руках.

А конь дрыжыць, плыве
па ветру грыва,
Крывёю зрэнкі цьмяныя
блішчаць.
Ды вось падковы, светлыя,
як рыбы,
Падручныя шпурляюць
з-за пляча.

Падковы — сонцы яркія —
палаюць,
Зямлю кругом такія
абягуць!
Стрыжэ вушамі чуйнымі
буланы
І ставіць асцярожна ён
нагу.

А праз хвіліну на дарозе
золкай
Снапамі іскраў разлятуцца
камяні,
І над зямлёй скапычанай
вясёлка
Падкоўваю на шчасце
зазвініць.

*Юрка ГОЛУБ*

## ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ

Песня крыло апальвала
На нямых агнях журавін...
Звінелі вязнямі буравы!

О, далёкіх гадоў трывога!
Трывога явак...
Вятры наўзрыд!
Ляцелі вершы з муроў
астрога
У Іспанію, у Мадрыд...

І адстуквалі пальцы кропкі:
Прашу дазволіць...
Хачу ў бой!..
У Бяздонным ніводнай
кропляй
Мой не затоне боль!

Прарастаюць зарніцы
сполахам
На азёрнай тугой шчацэ,
І песня калісь падпольная
Праз мяне да яго цячэ!

БЯЗДОННАЕ—возера непадалёк ад вёскі Рудаўка, на Слонімшчыне, дзе жыў бацька паэта.

* * *

*Алесь РАЗАНАЎ*

Адпачыць ад непаладку,
Шуму,
гвалту,
калатні.
Уцякаем без агляркі
У заціішныя куткі.

Праз лясы дарожка
тчэцца —
Каляіна.
Капыток.
Там маленства
чалавецтва,
Там пачатак.
Там выток.

Там гуляе ў пазалоце
З рыжым промнем
да цямна
На вярбе пушысты коцік,
Быццам з ніткай кацяня.

Ходзім смела,
Ходзім лёгка,
Без турботаў і пасад.
А да сталасці далёка,
Як вякі таму назад.

*Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ*

## РАНІЦАЙ ПАСТУКАЮ ТАБЕ

Раніцай пастукаю табе,
Назаву імя тваё,
прыцiхшы,
Самае святое на зямлі,
Тое, што ў мяне было
на вуснах,
Нават ветру я не давяраў,
Чыстае, як шэпат
раўчука.—
Толькі сонцу давяраў
і маю,
Ды яшчэ маленькім
галубам,
Каб яны прынеслі ў сваіх
дзюбах
Ранішнія промні ў цiхі
дом.
Стукнуўшы ў празрыстае
акенца.

*Анатоль КАЗЛОВІЧ*

## ПАПЛАВЫ, РУНЕЙЦЕ

Няхай сёння ноччу
пройдзе спорны дождж,
Каб зарунелі за вёскаю
высахлыя паплавы...
Каб вільготным лістом
трымцеў мой сад...
Каб салёнымі губы
ў закаханых былі...
А я буду думаць
аб іх усіх:
Як растуць і ўмываюцца
на паплавах травы...
Як у садзе маім —
раса і шум...
Як каханыя недзе
туляцца пад павець...
А заўтра няхай будзе
сонечны дзень:
Каб гусі вясковыя
высыпалі на паплавы...
Каб яблыкам з сада
блішчаць, рыпець...
Каб на душы ў закаханых
светла было...

Я буду думаць,
Пакуль не засну.

*Анатоль Казловіч*

## ДАРОГА

Пасля купання грэла
нас шаша—
Яна была гарачаю,
жывою...
Нам было добра
сцішыцца-ляжаць,
Прынікшы да яе даверлівай
шчакою.
Дарогу мы любілі за цяпло.
Было ж і не яно у нас...
Многа
Насустрач колкіх ветраў
працягло,
Ды ўперад-ўперад рвалася
дарога.

Яе праз рэкі, нібы
на руках,
Няслі мастоў двужылістыя
палі,
А каб у бездань чорную
не ўпала —
Слупкі са страху пабялелі
у гарах.

Паклонамі скрыпучых
жураваў
Сустрэць на Беларусі
выйшла вёска...
Дарога над разлівамі
бароў —
Ад зВёздалёта дымная
палоска.

* * *

*Эдуард ЗУБРЫЦКІ*

Абяцаў падарыць я табе неба сіняе,
Жураўлінае песні задумлівы звон,
Што плыве і плыве нада мной
баравінамі
У сутонне асенніх асмужаных дзён.
За далёкаю даллю азёр і вытокаў,
Дзе дажджы закіпаюць на рыжых
кастрах,
Спачываюць ад вечных вандровак
аблокі,
Спачываюць на чуйных сівых трысцягах.
Я ўстаю на світанку, буджу іх,
скалелых,
І аблокі ка мне неахвотна плывуць.
І аблокі, апошнія гронкі далёкага лета.
Не даплыўшы, спадаюць снягамі
ў траву.

Я стаю і маўчу... Мне б хоць кропельку
неба,
Неба сіняга, цёплага над галавой.
Толькі ж дыхае неба халоднае снегам
І назад жураўы прылятаюць з вясной...
Абяцаў падарыць я табе неба сіняе...
Вось яно, у вачах маіх, поўных адчаю.
Не крыўдуй, у мяне яно толькі
адзінае,—
Я другога не маю...



*Яўгенія ЯНІШЧЫЦ*

## БУДУЦЬ ВЁСНЫ І ПРАЛЕСКІ

*Звонка плешчуць вясной крыніцы,*
*Будзяць вёску маю жаўрукі.*
*Хай табе ў гэты момант прысніцца*
*Лёгкі дотык маёй рукі.*
*Зыркай-зыркай зара на золку*
*Ноч ціхутка кране крылом.*
*Хай табе прысніцца вясёлка*
*Мяккім матчыным ручніком.*
*Недзе там, ля зялёных плёсаў,*
*Светлы човен штурхае дзед.*
*Я бягу. Расплятаюцца косы,*
*Я гукаю, шукаю цябе.*

* * *

З-пад снегу цяжкага
высоўваюся
Ледзьве-ледзьве.
Ну,а потым з усмешкай
затоенай
На мяне паглядаюць
мядзьведзі.

Дзе вы, казанькі,
люлі-гулі,
Мая добрая няня.
Нараджаюся ў вясновым
гуле
Пралескаю першай
на заспежанай паляне.
Будуць вёсны і пралескі...
Будзе радасць і туга.
Адцвіце вясна на
ўзлеску,
Пабяжыць за сіні гай.
І хваёваю іглішай
Адзавецца лета звон.
Толькі мне не паўтарыцца
Ні вясною, ні зімой.

Столькі думак, самых
шчырых!
Светлы шлях мне пажадай.
Заўтра будзе сіні вырай
І бясконцы небакрай.
Будзе лета з навальніцай
І вясёлка над ракой.
Толькі мне не паўтарыцца
А ні летам, ні зімой.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

АТ 17354. Адрас рэд.: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 206, тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 788.